ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 81 (563) Чацьвер 21 ліпеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 27.

Адозва Комінтэрну

У зьвязку з апошнімі падзеямі ў Вене выканком Комуністычнага Інтэрнацыяналу выпусьціў адозву, у якой, між іншым, зазначана: «Калі масы сапраўды рэволюцыйнаму ўзьняліся на змаганьня за свае жыцьцёвыя патрэбы, аўстрыйская социял-дэмократыя думае толькі аб тым, каб прыдушыць гэтую барацьбу як магла хутчэй. Банкруцтва і здрадніцтва павінна быць выкрыта, яго трэба згаьбіць перад рабочымі ўсяго сьвету. Таварышы рабочыя! Выкрыйце здрадніцтва аўстрыйскай социял-дэмократыі. Адмоўцеся выконваць не згодніцкія і здрадніцкія дырэктывы. Спыніце парляманцкія інтрыгі і гандлярства социял-дэмократычных правадыроў. Ня спыняйце барацьбы і забастоўкі, пакуль вы не дасягнеце сваёй мэты.

Дамагайцеся ўзброеньня рабочых, разброеньня фашысцкіх організацый і паліцыі, утварэньня рабочых саветаў па ўсім краі для мобілізацыі мас і кіраўніцтва барацьбою. Дамагайцеся рабоча-сялянскага ураду. Распачалася суровая траўля комуністаў. Арыштоўваюцца рабочыя, сярод якіх большасьць комуністаў; пазайманы памяшканьні ЦК компартыі і комсамолу Аўстрыі. Уся масавая барацьба малюецца, як справа «рук Масквы». І гэта—у краі дзе ёсьць сотні тысяч сяброў социял-дэмократычнай партыі, у краі, які малюецца як социял-дэмократычны «рай». Комуністы стаялі і стаяць у першых шэрагах барацьбы. Яны змагаліся разам з масаю, а ня проці яе, як социял-дэмократы. І рабочыя масы зараз змагаюцца за рэволюцыйныя лёзунгі компартыі, а не за банкроцкую рэформісцкую політыку социял-дэмократыі.

Аўстрыйская компартыя выконвала, выконвае і будзе выконваць свой рэволюцыйны абавязак. І з гэтае прычыны проці яе накіроўваецца армія социял-дэмократаў і буржуазнага ураду. Дзеля гэтага сусьветны і аўстрыйскі пролетарыят павінны выказаць аўстрыйскай компартыі сваю поўную салідарнасьць. З гэтае прычыны аўстрыйскія рабочыя павінны пайсьці пад яе кіраўніцтвам. Рэакцыйны ўрад Зайпеля гатоў змагацца проці пролетарыяту да канца. Не здаволіўшыся ўжо пралітаю крывёю, ён выклікае новае войска, абвяшчае выключнае становішча і пагражае інтэрвэнцыяй чужаземнага войска. Гэты рэакцыйны ўрад неабходна скінуць. Войска, што насылаецца проці рабочых павінна перайсьці на бок апошніх і змагацца разам з імі. Ніводзін чужаземны салдат не павінен ступіць на тэрыторыю Аўстрыі для прыдушэньня аўстрыйскіх рабочых. Комуністычны Інтэрнацыянал гарачае рэволюцыйнае баявое прывітаньне. Няхай рабочыя Вены і Аўстрыі ведаюць, што ў гэту цяжкую гадзіну—разам з імі рабочыя ўсіх краёў.

Барацьба ня спыніцца, як ні стараліся-б социял-дэмократы прыдушыць аўстрыйскае паўстаньне. Ліпнёўская навальніца дала рабочым Аўстрыі новы шлях. Наперадзе новыя вялікія рэволюцыйныя буры. Барыкады на вуліцах паказваюць, як здольна і як будзе рабочая класа змагацца за свае інтарэсы, за справу пролетарскай рэволюцыі.

Рабочыя і працоўныя сяляне! Рабочая моладзь! Салдаты! Усе на дапамогу рабочым Вены і Аўстрыйскаму пролетарыяту. Прэч социял-дэмократычны ўрад! Няхай жыве нашчадная барацьба проці фашысцкай рэакцыі! Няхай жыве ўзброеньне пролетарыяту! Няхай жывуць рабочыя саветы ў Аўстрыі! Прэч урад Зайпеля! Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад! Няхай жыве перамога чырвонай Вены—перамога аўстрыйскай рабочай класы.

Выканком Комінтэрну.

Масква, 18-га ліпеня 1927 г.

Баявы іспыт

У ноч з 16 на 17 ліпеня адбыліся маневры комсамольскага актыву Менскай гар. організацыі, організаваныя Акруткомам ЛКСМБ і рэдакцыяй „Чырвонай Зьмены“.

Манэўры, зьяўляючыся найлепшай формай ваенізацыі комсамолу, аднычасова далі магчымасьць праверыць увагу да справы абароны краіны ня толькі з боку актыву, але і з боку ўсёй комсамольскай організацыі.

На падставе вопыту манэўраў—збор, настрой у паходзе, адносіны да баю—мы можам з упэўненасьцю заявіць, што Менская гар. організацыя спаяна, дысцыплінавана, што яна сур'ёзна ўзялася за вывучэньне вайсковай справы, што яна задачы партыі і комсамолу ў бягучы момант—**уцяміла**.

Адпак, на шэрагу з гэтым, выявілася, што ў організацыі маюцца яшчэ і такія асобы (шэраговыя і актыў), якія да справы ваенізацыі адносяцца **зусім дрэнна**. Гэта відно было з іх адносін—нецярпімых з боку комсамольца—да аружжа, да прыказаў камандзіраў і наогул да манэўраў.

Такія таварышы, хоць іх і адзінкі, мяшаюць нам працаваць. Яны дапамагаюць не нам, а нашым **ворагам**. На іх у момант баявога іспыту **нельга** палажыцца. Гэта **не** комсамольцы-ленінцы, а благадушныя абывацелі, якім **не павінна быць месца** ў нашых баявых шэрагах.

Манэўры выявілі і тое, што нам усё-ж такі трэба яшчэ большая закалка, вынослівасьць; што ў адносінах вайсковай справы нам трэба набыць вядомыя навыкі, якія неабходны байцу для выкананьня розных загадаў у якіх бы то ні было цяжкіх абставінах.

Некаторыя з шэраговых комсамольцаў засталіся нездаволенымі, што ў манэўрах удзельнічаў толькі актыў, а не ўся організацыя.

Гэта, вядома, добра. Гэта лепш за ўсё сьведчыць аб **кроўнай** зацікаўленасьці комсамольцаў справай ваеннага абучэньня. Гэта сьведчыць аб іх гатоўнасьці стаць грудзьмі на абарону краіны будуючагася соцыялізму. (Між іншым, няхай ведае аб гэтым Чэмбэрлен!).

Але ў данным выпадку не павінна быць ніякай абіды таму, што на абслугоўваньне большага ліку людзей ня было сіл і магчымасьцяй.

Нельга не адзначыць той вялікай ролі, якую адыграў у справе організацыі і ходзе манэўраў камсклад вайсковых частак. Правесьці іх (манэўры) організавана магчыма было толькі з яго дапамогаю.

Зараз задача Менскай організацыі зводзіцца да таго, каб вывікі манэўраў былі прадуманы кожным актывістым, каб на падставе гэтага кожнай ячэйкай былі складзены конкрэтныя пляны ваенізацыі комсамольцаў. Трэба дабіцца таго, каб кожны комсамолец быў навучаны **працаваць ва ўсіх галінах сваёй дзейнасьці з ваеннай точнасьцю і дысцыплінаванасьцю.**

Памяці Ф. Э. Дзяржынскага

Год таму назад памёр тав. Дзяржынскі.

Рэдка хто можа так працаваць, як працавала гэта кіпучая сіла, бо ў кожнага чалавека ёсьць нэрвы, і кожны жывы чалавек можа выканаць такую працу толькі ў пэўнай меры.

Праца была настолькі цяжкая, яна патрабавала такога вялізарнага напружаньня, яна была такой пякельнай працай, што патрабавала сапраўды вялізнага характару. І т. Дзяржынскі гэту працу вёў ад пачатку і да самага канца. Ён правёў сваю ўстанову—ЧК, а пасьля, ДПУ—праз строй сапраўды страшных іспытаньняў, і трэба сказаць, што бывалі часы, калі гэта ўстанова зьяўлялася па сваёй працы адной з самых уворных.

Вялікае значэньне ў гэтай працы меў асабісты аўтарытэт тав. Дзяржынскага, яго няўпынная праца, яго вар'яцкая адважнасьць, яго асабістая пагарда да сьмерці, яго сталая праца, якая ні на хвіліну не прыпынялася.

Жыцьцё, барацьба і сьмерць тав. Дзяржынскага павінна служыць прыкладам для ўсіх нас, як трэба ахвяраваць сабою за справу рэволюцыі, як трэба берагчы адзінства партыі, як трэба абараняць краіну Саветаў ад проіскаў белагвардзейцаў і шпіёнаў.

Надыходзіць жнівень. Час падпісацца на „Чырвоную Зьмену“

Гэроічная барацьба Аўстрыйскага пролетарыяту

Социял-дэмократы імкнуцца ўсімі сродкамі прыдушыць рэволюцыйны рух

Компартыя Аўстрыі на рэволюцыйным шляху

Сэнс падзей у Аўстрыі

Калі можна было чакаць рэволюцыйнага ўзрыву ў якой-небудзь з Эўропэйскіх краін, дык, у апошнюю чаргу, магла узьнікнуць думка аб гэтым у адносінах да Аўстрыі.

Вайна ня толькі разбурыла Аўстрыю і давяла яе да голаду, але і прывяла да дзяржаўнай катастрофы, якая закончылася поўным распадам на шэраг незалежных дзяржаў, як Вэнгрыя, Чэха-Славакія і адыход асобных вобласьцяў да Сібіры, Польшчы і Румыніі. Ад ранейшай агромністай аўстра-вэнгэрскай манархіі засталася толькі маленькая рэспубліка ў 6 мільёнаў насельніцтва. Да гэтага трэба дадаць, што і ўсе прамысловыя вобласьці таксама аддзелены ад Аўстрыі.

Социял-дэмократычнае разгуляваньне масавага руху на вуліцах Вены.

Аўстрыйская рэспубліка апынулася ў драпных варунках. Выхадам з гэтага становішча было толькі далучэньне яе да больш моцнай родсьцьвеннай дзяржавы—Нямеччыны. Але дзяржавы, перамогшыя ў эўропэйскай вайне, забаранілі гэтае аб'яднаньне. Яны баяліся іх узмацненьня.

Экономічны крызіс ударыў у першую чаргу, вядома, па рабочай клясе і выявіў сябе як у вялізарным беспрацоўі, так і ў агромністым зьніжэньні заробчай платы і наогул жыцьцёвага ўзроўню.

Пасьля вайны, у часе крызісу **аўстрыйскія прадпрыемствы** шпаркім тэмпам пераходзяць у рукі **пераважна францускаму і ангельскаму капіталу пад уладаў якога знаходзяцца і па гэты час.**

Пасьля зьвяржэньня манархіі ў 1918 годзе, улада належала фактычна пролетарыяту. Рабочыя амаль пагалоўна былі ўзброены. Здавалася, што пры такіх умовах можна было ўтрымаць ня толькі дзяржаўную ўладу, але правесьці самую карэнную социяльную перабудову. Але пануючай социял-дэмократычнай партыі пролетарская рэволюцыя не па густу. Яны пачалі барацьбу не за пролетарскую ўладу, а за зварот яе ў рукі буржуазіі. І ў выніку, апіраючыся на «хрысьціянскіх социялістых», на чале ўлады аказалася буржуазія. Пад прыкрыцьцем «хрысьціянскіх социялістых» (партыя рэакцыйнай дробнай буржуазіі) пышнымі кветкамі распусьціліся фашысцкія організацыі, так званыя «гакенклейцары».

Для таго, каб разьбіць зьяднанасьць рабочых, каб паслабіць іх саюзы і прымусіць іх адмовіцца ад масавых забастовак і выступленьняў, аўстрыйская буржуазія пачала пушчаць у ход усю гэтую фашысцкую гвардыю. Павялічыўся лік нападаў на рабочых і забойствы іх фашыстамі, пры чым, буржуазныя суды systэматычна апраўдваюць забойц.

Праўда, социял-дэмократы стварылі таксама і свой „саюз абароны“ (шуцбунд). Гэты саюз пад камандай социял-дэмократычных бюрократаў, якія лічаць, што рэспубліку трэба ахоўваць ня столькі ад фашыстых, колькі ад комуністых, пачаў шалёную траўлю апошніх. Хоць комуністых і надзвычайна мала ў Аўстрыі, затым што социял-дэмократычны ўплыў на рабочых, які існуе дзесяткі год, яшчэ вельмі вялікі, як раз на комуністых накіроўваецца галоўнае ненавіджаньне социял-дэмократаў.

Але, вядома, рэволюцыйны сэнс выступленьня венскага пролетарыяту заключаецца не ў яго адказе на той ці іншы прыватны выпадак фашыстых.

Значэньне венскіх падзей у тым, што аўстрыйская рабочая кляса, спаткнуўшыся з грубай сілай дзяржаўнага апарату буржуазіі, на справе пераканалася, што клясавая барацьба—ня выдумка комуністых і што захоп улады зьяўляецца асноўнай задачай пролетарыяту, які імкнецца да свайго вызваленьня.

Крывавыя падзеі ў Вене.

Злосьць і абурэньне, ахапіўшае венскіх рабочых з прычыны апраўданьня двух такіх забойц, паслужылі поводам да адкрытага выступленьня венскага пролетарыяту, якое ператварылася ў крывапралітныя бітвы на вуліцах сталіцы. У рабочых раёнах страляюць у паліцыю са страх, рабочыя займаюць радые-станцыю і спыняюць ямскія транспарты, рабочыя патрулі ахоўваюць граніцы і кантралююць рух па Дунаі, каб своечасова адхіліць правакацыю з боку вэнгерскіх ці венскіх фашыстых.

Выступленьне рабочых у Вене падняло паўсюду рабочых на ногі наперакор волі официйных лідэраў рабочага руху. У Градзе, Клагенфурце, Ліце адбыліся вялікія дэмонстрацыі. Рабочыя патрабуюць адстаўкі ўраду Зайпеля, прыдушэньня фашызму і стварэньня рабочага ўраду.

Забастоўкай былі ахоплены дзесяткі тысяч рабочых транспарту, пошты, тэлеграфу, тэлефону, шмат якіх фабрык, заводаў і гандлёвых прадпрыемстваў.

Камуністыя ў першых шэрагах змагаючыхся.

З прычыны склаўшагася такога становішча аўстрыйская компартыя высунула патрабаваньні неадкладнага склікання ўсеаўстрыйскага камітэту з прадстаўнікоў ад вялікіх завадзкіх камітэтах, які павінен ухваліць рэзолюцыі аб неабходнасьці політычных мерапрыемствах: узброеньня рабочых; разброеньня паліцыі і фашысцкіх організацый; прадаўжэньня ўсеагульнай забастоўкі; утварэньня рабоча-сялянскага ўраду.

Комуністы працуюць паўсюды сярод мас у першых шэрагах, кіруюць, падштурхоўваюць, тлумачаць неабходнасьць зьвяржэньня буржуазнага ладу. Комуністы—верныя барацьбіты за справу працоўных!

Дэмократы прыдушаюць рабочы рух.

Аўстрыйская социял-дэмократыя з усіх сіл імкнулася спачатку ўзяць рух у свае рукі і весьці яго далей, г. зн. паступова прыдушаць. Аднычасова з гэтым яны прыкладалі ўсе патугі, каб выкарыстаць рэволюцыйны агонь змагаючыхся мас для таго, каб згандлявацца з буржуазіяй аб заключэньні коаліцыі. Але ўсяго, чаго яна дабілася, гэта—стварэньня гарадзкой венскай паліцыі з сяброў социял-дэмократычнай партыі для прыдушэньня рэволюцыйнага руху рабочых Вены. Але і прыдушыць рэволюцыйны масавы рух яна не змагла.

Масы, пастаўленыя перад пытаньнем барацьбы за элемэнтарныя жыцьцёвыя ўмовы, адмаўляюцца ісьці па социял-дэмократычнаму шляху і ўступаюць на шлях рэволюцыйны.

Іх адрас—Ленінград, Кірачная

Гузянкоў Гарасім Міронавіч радзіўся ў вёсцы **Лубянкі**, Барысаўскага раёну, Магілеўскае акругі.

Гадоў дваццаць таму назад, за сваю аддапасьць божаму памазаніку цару Міколаю і айчызьне, Гузянкоў пападае ў Рагачоўскі карацельны атрад коннай жандармэрыі, дзе з гонарам і нясе абавязкі галоўнага начальніка аж да Бастрычніцкаўскіх дзён.

За час свайго «главенства» Гарасім Міронавіч «кроў'ю і потам» паставіў сабе на адной з вуліц рагачоўскіх два дамы.

Пасьля таго, як турэмнікі паздымалі краты ў Рагачоўскай турме, вышлі на волю і пазрывалі ў гарадзкога начальства апалеты, а частку, больш заядлых сабак, пасадзілі на сваё месца. Гарасім Міронавіч пакідае «наседжанае» месца і перасяляецца ў лясы бацькаўшчыны, у стройны бярэзьнік і алешнік Барысаўскага раёну, адкуль бандаю нападае на баржы, што падвозілі па Сожу харчы і зброю атрадам Чырвонай Гвардыі, нападае на сялянскія падводы, што везьлі апошнія сабраныя кускі хлеба сынам сваім—барацьбітам за лепшае жыцьцё...

Хвалі рэволюцыі крыху ўлягліся. Сьціхлі гарматы грамадзянскай вайны. Гарасіму Міронавічу няма кага рабаваць, яго надзеі—вярнуць былое—канчаткова разьбіліся.

І Гузянкоў зноў і балоты займае вёскай Лубянкі, сваёй праўдзівай «бацькаўшчынай».

Лубянцы праводзілі карэннае землеўпарадкаваньне. «Варацілы» Лубянскага сельсавету—бліжэйшая радня Гузянкова. Дык чаму-ж быламу «начальніку Рагачова» не атрымаць надзелу зямлі? Гарасім Міронавіч атрымлівае дзесяцін 6 зямлі, здае яе беднякам засяваць на часьць, а сам едзе ў горад Рагачоў—там яго два дамы ў арэндзе, і «хлеба» інтэлігэнтнай сям'і хопіць.

К гэтаму часу Гузянкова сыны—**Васіль** і **Даніла**—павырасталі. Вучыцца хлапцам трэба. Але-ж як паступіць? Дзеці былога начальніка карацельнага атраду і ў вышэйшую школу прыняты не могуць быць!

Гарасім Міронавіч, доўга ня думаючы, едзе ў Лубянку, бярэ, ад сельсавету (у сельсавеце—свой народ) паперкі, што ён—Гарасім Гузянкоў—найпяршы беднак у вёсцы, што жыве з свае працы і ніякай сувязі з ранейшымі організацыямі і царскай уладай ня меў. А сынам Васілю і Данілу дастае пасьведчаньні за належнымі подпісамі, падмацаваныя пячаткай з гербам савецкім, што хлопцы—па «яць», дзень і ноч заняты грамадзкай працай, вядуць выхаваўчую працу сярод лубянскай моладзі, заўсёды чытаюць насельніцтву газэты, ратлумачваюць незразумелае, карыстаюцца пашанаю. Наогул кажучы, «агітуюць за Савецкую Уладу».

З такімі моцнымі дакумантамі, Васіль і Даніла, благаслаўлёныя Гарасімам Міронавічам, едуць у Ленінград, знаходзяць на Кірачнай вуліцы **45/а Топографічны тэхнікум**, куды і паступаюць вучыцца.

З таго часу прайшло ўжо тры гады. Зараз Васіль і Даніла Гузянковы перайшлі на апошні курс навучаньня. Увесь час прабываньня ў тэхнікуме лічацца найбяднейшымі студэнтамі і згодна дакумэнтаў атрымліваюць у першую чаргу стыпэндыі.

А што робіць стары Гузянкоў!

Калі надаесьць сядзець у Рагачове, ён наймае падводу з рыпучымі коламі і едзе ў Лубянку рабіць агляд спраўнасьці свайй гаспадаркі. Тут вядзе самую злосную агітацыю супроць Савецкай улады, комсамолу, піонэраў.

Надаела Лубянцам слухаць натацыі старарэжымца Гарасіма Міронавіча. Пачалі яны прапытваць людзей, якія-б суцішылі гэтага чалавека.

Задубская комсамольская ячэйка прышла першай на дапамогу лубянцам. Па яе стараннасьці, беднякі адсудзілі ў Гузянкова зямлю, а справы аб **„студэнтах-бедняках і грамадзкіх працаўніках“ Васілю і Данілу** перададзены ў Барысаўскую міліцыю.

Прайшло з поўгода, а вынікаў расьледаваньня гэтай гнуснай справы няведна. Мабыць, і міліцыя ў Барыме «сымпатызуе» Гарасіму Міронавічу.

Дык у такім разе, жаданым госьцем для Лубянцаў будзе Магілеўскі акруговы пракурор.

Зьм. Паваротны.

На балотах заквітнеюць нівы.

СТАРОБІНСКАЯ ЯЎРЭЙСКАЯ БЕДНАТА, ОРГАНІЗАВАЎШЫСЯ Ў МЭЛІОРАЦЫЙНАЕ ТАВАРЫСТВА, АСУШЫЛА БОЛЬШ 100 ДЗЕСЯЦІН НЕПРАХОДНАГА БАЛОТА.—СЯЛЯНСТВА ПЕРАМЯНІЛА СВАЕ ПОГЛЯДЫ НА ЯЎРЭЯЎ-ЗЕМЛЯРОБАЎ.—КАРОЎЧЫНЦЫ АСУШАЮЦЬ БАЛОТА, А ШТО РОБІЦЬ КОМСАМОЛЬСКАЯ ЯЧЭЙКА?

Яўрэйская бедната асушыла балота.

(Старобінскі раён, Бабруйская акруга).

„Вялікі мох“, трасіны—так завуць старобінцы балота, што акружае мястэчка. Толькі ўзімку ў часе вялікіх марозаў можна было прабрацца туды за сасновым скарчаўем.

Ня толькі жывёла не магла туды нагой ступіць, але нават птушкі не садзіліся. Тут пачатак **Пінскіх** балот.

У сувязі з выданьнем дэкрэту аб надзяленьні яўрэяў зямлёй, зацікавілася старобінская яўрэйская бедната. А дзе узяць зямлі?

Інжынеры-тэхнікі параілі асушыць бліжэйшы ўчастак балота. Узялася яўрэйская бедната.

У 1924 годзе ўтварылася **Старобінскае мэліорацыйнае таварыства.** Уступіла ў яго 60 чалавек. Некаторыя сяляне сьмяяліся, што «дурні яны, таму і лезуць у балота». Але бедната ўсё-ж такі палезла ў балота. Праўда, спачатку вышла няўдача. Дзякуючы памылкам, што зрабілі кіраўнікі прац па асушцы, вынікаў ніякіх не ўдалося атрымаць. **Таварыства скарацілася на палову.** Але ўпарта перамагаючы вялікія цяжкасьці яно працягвала сваю працу. Усяго пад мэліорацыйныя работы было адведзена 250 дзесяцін.

Каля балота ёсьць гатовы вадапрыёмнік—рака **Случ.**

Заставалася такім чынам правесьці цэнтральную магістраль і бакавыя стрэлкі.

Згодна статуту мэліорацыйнага таварыства, кожны сябра яго павінен адпрацаваць 50 рабочых дзён у рабочы сэзон, а нястачу рабочай сілы таварыству прышлося пакрыць наймам за лік атрыманага доўгатэрміновага дзяржаўнага крэдыту.

Прыняўшы пад увагу ўсю каштоўнасьць гэтых работ, дзяржава ўзяла на свой кошт **выдаткі па вынаходжаньню і дрэнажыраваньню.** А карчоўка, першае ворыва і культурна-тэхнічныя мерапрыемствы праводзіліся **на сродкі таварыства і сіламі яго сяброў.**

Калі сышла вада з балота, таварыства прыступіла да раскарчоўкі плошчы.

Гэта опэрацыя патрабавала вельмі шмат сіл і вялікай колькасьці сродкаў. Наколькі цяжка гэта праца, відаць хоцьбы і з таго, што за раскарчоўку і расчыстку адной дзесяціны балота насельніцтва патрабавала ня менш 80 рублёў, а каб раскарчаваць дзесяціну, патрэбна было ня менш 10 чалавек на працягу цэлага тыдню.

Пасьля раскарчоўкі ішлі працы па адбудаваньню дрэнажоў.

Дрэнажыраваньнем была дасягнута поўная асушка мясцовасьці і калі раней яна зьяўлялася вялікай непрыступнасьцю, то зараз **трактар можа сьмела гуляць па палосам „абноўленай зямлі“.**

Не супынілася таварыства і перад выдаткам сродкаў на пакупку мінеральных угнаеньняў, бо ўнёсшы калійную соль в супэрфосфатам, можна атрымаць вялікі ўраджай.

Вынік працы—дасягненьні

Раскарчована **100** дзесяцін. У гэтым годзе пракладзены дрэнажы на плошчы **40** дзесяцін. **35 дзесяцін засеена.**

Усяго на крысе ёсьць на вопытным полі таварыства.

5 дзесяцін аўсу, як зялёны аксаміт, распласталіся на балоце: капуста, турнэпс, бручка, морква і г. д.

Звычайная балотная дзесяціна сенажаці дае **150 пудоў у адзін укос,** а мэліоратары атрымалі **370 пудоў з дзесяціны і няменшага ўкосу чакаюць увосень.**

У мінулым годзе на Слуцкай сельска-гаспадарчай выстаўцы старобінскія мэліоратары атрымалі пахвалу за свой экспонат—качан капусты вагою больш пуда.

Бачачы такія дасягненьні на балоце, сяляне перамянілі свае погляды на яўрэяў-земляробаў, а сябры мэліорацыйнага таварыства яшчэ з большай энэргіяй бяруцца за працу.

Глядзіш на жывую справу соцыялістычнага будаўніцтва ў такім глухім раёне і зішні раз пераконваешся, што **грамадзкая ініцыятыва пры дзяржаўнай дапамозе сапраўды можа тварыць цуды.**

А. Ф.

Жывыя песьні аб новым

Ліпень. Гарачае сонца разблытала свае праменьні над балотам.

Трэці дзень упарта працуе комсамолец Яська на балоце. Хоць адразу і сьмяяліся барадачы-сяляне з яго комсамольскай выдумкі і баяліся супярэчыў, што ня трэба асушаць балота і дарма траціць на гэта сілы.

Праца цяжкая. Але радасьць гарэла ў вачох і сэрца маторам выігрывала хуткую перамогу.

Капаючы балота, Яська спатыкаўся на розныя карчаўе і паленьне. На чацьвёрты дзень сяляне ўбачылі на балоце цэлыя кучкі смолістага дрэва, якое хутка высахла на сонцы. Дзівіліся сяляне, адкуль гэта ён назьбіраў столькі дроў.

— І добра будуць яны гарэць у печы!—казалі сяляне.

Весь, дзе жыў Яська, ужо шмат год мучыцца ад недахопу апалу.

Калі пачынаў Яська капаць балота, дык ён ведаў, што ў ім знойдзе шмат добрага апалу. Так і вышла.

Сяляне перасталі сьмяяцца над Яськінай працай, але самі балота не чапалі.

* * *

Мінуў ужо трэці год, як Яська скончыў працу па асушцы балота.

Цяпер на балоце квітнеюць лужкі і хвалюецца залацістае жыта. Турнэпс тоўстымі пнямі лезе з зямлі. Яшчэ больш ахнулі ад зьдзіўленьня сяляне і па іншаму пачалі думаць.

* * *

Калі насталі цёплыя ліпеньскія дні ў гэтым годзе, ужо заварушылася ўся вёска. На балоце, што каля гаю разьляглося шэрай коўдраю на цэлыя вёрсты, зьвіняць лапаты, мітусяцца шэрыя сьвіткі. А ўвечары адтуль пяюцца гучныя песьні —«ой, на мохавым балоце заквітнеюць нівы»...

Бягуць гукі песень гэтых і калышуць балотныя прасторы, рассякаючы вячэрнія, васільковыя зморкі.

Янка Шаірка.

А дзе была ячэйка?

(Магілеўская акруга, Лупалаўскі р., Кароўчына)

Гэктараў 50 прасторы ў вёсцы Кароўчына знаходзіцца пад балотам. За гэту плошчу ўзяліся ў 1926 годзе сяляне. Наймалі грабароў, зрабілі ўмову, згодна якой кароўчынцы павінны былі ўносіць грошы ў некалькі тэрмінаў. Але на працягу ўсёй працы грабароў, **мала хто з карочынцаў уносіў належную суму грошай,** ды і ўнесеныя пападалі ва **ўласную кішэню сяброў камісіі,** якой было даручана кіраваць працай па асушцы балот.

Канавы былі пракапаны, але ў сучасны момант **пазаганяла іх тваньню. Пні,** якія сустракаліся на шляху канавы **—ня выкароўваліся.**

Быў суд за невыплату грошай за працу. Прыпаялі кароўчынцам у двайне. Зачухалі патыліцы нашы сяляне.

Закончылася гэта справа так нудна таму, што кіраўніцтва ёю не папала ў належныя рукі. **Комсамольская ячэйка асушкай балота зусім не цікавілася.**

Ляпінскі Сымон.



Па прыкладу лепшых

Прымай удзел у рацыяналізацыі сваёй вытворчасьці

Конкурс на лепшага вытворцу.

(Віцебск, Камтрэст).

У мэтах надняцьця зацікаўленасьці і актыўнасьці моладзі ў вытворчай, профэсыйнай і грамадзкай рабоце, фабком Камтрэсту, па ініцыятыве ячэйкі КСМ, парашыў правесьці конкурс.

Усяго ў конкурсу прымае ўдзел 23 маладых рабочых ад 5 прадпрыемстваў: дэпо трамваю—8 чал., вадакачка—3 чал., электрастанцыя—6 чал., лесазавод—5 чал., лазьня—1 чал.

Высунута аўтарытэтная конкурсная камісія, у якую ўвайшлі: прадстаўнік адміністрацыі, 3 рабочых з розных прадпрыемстваў, нам. дырэктару камтрэсту ад моладзі (апошні—старшыня камісіі), прадстаўнік ад Акруговага Савету Профсаюзаў і 2 сябры праўленьня саюзу ПКГ. Камісіяй была выпушчана адозва да ўсіх рабочых Камтрэсту аб падтрыманьні конкурсу.

Вось умовы конкурсу: 1) яўка на работу без спазьненьняў, 2) зьніжэньне прагулаў і «бузы», 3) добрыя адносіны да матар'ялу, 4) прыкладнае трыманьне ў цэху, 5) абавязковае наведваньне ўсіх вытворчых нарад і грамадзянскіх сходаў, 6) падпіска на адну з газэт, 7) рэгулярная уплата сяброўскіх узносаў, 8) абавязковае заняцьце спортам.

Кожны сябра конкурснай камісіі выявіўляе на месцы настрой і адносіны моладзі да конкурсу. Праводзяцца гутаркі з Месцкомамі. Конкурс асьвятляецца ў насьценгазэце. Моладзь адносіцца да конкурсу уважліва. Кожны жадае атрымаць першы прыз.

Конкурс будзе выяўляцца ў працэсе работы. Пачаўся ён з 1-га чэрвеня і будзе працягвацца да 1-га верасьня г. г.

Вызначаны наступныя прызы: 1-ы—добрая бархатная таўстоўка, 2-гі—добрыя штаны і 3-ці—поўная леvінская бібліятэчка.

Пакуль на першым месцы ідзе дэпо трамваю.

Праводзімы конкурс на лепшага маладога вытворца—грамадзкага работніка, безумоўна будзе выклікаць узмацненьне актыўнасьці моладзі ў штодзённай рабоце на вытворчасьці.

Лібурн.

Рацыяналізацыя.

У іх.

У нас.

А мы вось чаго дасягнулі

(З матар'ялаў райконфэрэнцый Бабруйшчыны)

— Прагулы сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, — кажа сакратар Рагачоўскага РК,—на некаторых прадпрыемствах амаль зусім зьнішчаны. Вось лічбы прагулаў:

Лесазавод МББ чыг. Сьнежань 1926 г. у дарослых прагулаў няма, а ў моладзі—2; **студзень 1927 г.:** у дарослых—2, у моладзі—1; **люты:** у дарослых—2, у моладзі няма; **сакавік:** у дарослых—3, у моладзі—няма.

Фабрыка ім. Сталіна. Сьнежань 1926 г.: у дарослых—8 прагулаў, у моладзі—няма; **студзень:** у дарослых 17, у моладзі—няма; **люты:** у дарослых—14, у моладзі—няма і г. д.

Калі раней было шмат выпадкаў манкіраваньня работай—спазьненьні, надбайныя адносіны да інструмэнтаў,—то зараз гэтага няма. У вытворчых нарадах моладзь прымае актыўны ўдзел. Так, напрыклад, у вытворчых нарадах удзельнічае: на заводзе МББ—50 проц., на фабрыцы ім. Сталіна—27 проц. моладзі.

— **Яч. лесазаводу** гор. Жлобіна (з дакладу Жлобінскага РК) заслухала даклад дырэктара заводу, праводзіла нарады комсамольцаў-вытворцаў. Старшыня вытворчай камісіі ў іх—комсамолец.

— На заводзе «Спартак»—старшыня вытворчай нарады таксама комсамолец. Большасьць комсамольцаў уцягнуты ў вытворчую нараду. Прагулы амаль што зьнішчаны. Па гэтаму пытаньню быў праведзены сход моладзі. Большая частка комсамольцаў знаходзіцца на кваліфікаванай працы і зьяўляецца прыкладнымі рабочымі. Хуліганства, якое было раней, ліквідавана.

Зрокаў.

З пару—на электрыцтва

Комсамольцы не наведваюць вытворчыя нарады

(Менск, дрожджавы завод „Пралятары“)

Дзякуючы таму, што ў сыравіне заводу «Пралятары» пачалі ўводзіць супэрфасфат і іншыя фізіолёгічныя рэчы, **павялічыўся выхад продукцыі:** раней з аднаго пуду сыравіны выходзіла 18 хунтаў дрожджаў. Зараз-жа 23-24 хунты. Гэтае мерапрыемства таксама палепшыла і якасьць дрожджаў.

Праведзена **электрафікацыя заводу.** Завод зараз працуе на электрыцтве.

Дзякуючы гэтаму—павысілася вытворчасьць працы ў упакавальным аддзяленьні на 8-10 проц. Нас ольні павысілася вытворчасьць і ў аддзяленьнях збойкі і забойкі скрынак.

Электрафікацыя дала магчымасьць заводу абыходзіцца без часовых рабочых.

Праведзена рацыяналізацыя рабочай сілы ў саладоўні: замест былых там 11-ці зараз працуе 9 рабочых.

Вытворчыя нарады на заводзе «Пролетары» **зусім рэдка праводзяцца** —1 раз у 3 месяцы. Наведваюць вытворчыя нарады 25-30 чал. з працуючых на заводзе 127 рабочых.

Нечага ўжо і казаць пра удзел у вытворчых нарадах комсамольцаў і моладзі заводу. Нават **вылучаны** ад ячэйкі у вытворчую камісію **комсамолец ня прысутнічае на яе пасяджэньнях.**

Траба, хлапцы, падцягнуцца!

Тры месяцы праверкі

(Ачковая фабрыка, Віцебск)

Па ініцыятыве праўленьня саюзу металістых і комсамольскага райкому пачалася падрыхтоўка да конкурсу. Створана спэцыяльная камісія, куды увайшлі інструктар фабрыкі, прадстаўнік ячэйкі, адзін рабочы спэцыялісты і работніца. Конкурс будзе выяўляцца ў працэсе штодзённай работы. У ім прымае удзел уся моладзь фабрыкі да 23-х год, у колькасьці 60 чалавек.

Удзельнікі конкурсу падзелены на 3 групы: група выходзячых з броні, група працуючых на фабрыцы і група наступаючых.

Конкурс павінен выявіць узмацненьне вытворчай дысцыпліны на фабрыцы, паменшаньне браку, зьнішчаньне «богатых» з цэху у цэх у часе працы. Усёй работай па конкурсу кіруе фабком і бюро комсамольскай ячэйкі.

Конкурс будзе працягвацца 3 месяцы.

Ачковац.



КУТОК МАЛАДОГА ПЧАЛЯРА

Раеньне пчол

Раеньнем называецца аддзел з вульля некаторай часткі пчол з маткай для ўтварэньня новай самастойнай сям'і. Нявопытнаму чалавеку цяжка ўлавіць маленькія прыметы, якія папярэджваюць раеньне, але ёсьць адна прымета якой можна здагадацца аб раеньні пчол: гэта закладка ў вульлі матачнікаў (пчолы закладваюць матачнікі пшчэ і ў тым выпадку, калі яны захочуць зьмяніць сваю матку, ці калі матка загінула).

Першы рой выходзіць заўсёды са старой маткай і толькі ў тым выпадку з маладою, калі старая матка загінула.

Як толькі пчолы запячатаюць хоць адзін ці некалькі матачнікаў (матачнікі пячатаюцца на 7-8 дзень пасьля пакладу ў іх яек), а то і раней азначанага моманту, калі пчол ахопіць так званая раявая гарачка, сям'я адпускае рой.

Першы рой пры нармальных умовах адыходзіць сярод дня, ад 10-2 гадзіны дню і толькі ў добрую пагоду. Калі стаіць доўгі час дрэнная пагода сярод дня, раніцою і вечарам бывае добрая пагода, то пчолы могуць адраіцца і у іншы час дня.

Пры вядзеньні пчалаводнай гаспадаркі ў рамачных вульлях, вельмі лёгка вызначыць час выхаду рою, таму-ж, хто трымае пчолы ў калодах, прыходзіцца ўважліва сачыць за пасекай. Заўважыўшы, што пчолы хутка ўцякаюць з якога небудзь вульля не сунімаючыся, падымаюцца ўверх, носячыся ва ўсе бакі з асобым моцна зьвінячым гукам—трэба быць на пагатове.

Тады перад вачыма пчалавода адчыніцца цікавы малюнак: на зьмену зьвярнуўшыхся з кароткага, але радаснага палёту, усё больш і больш уляцяюць новыя пчолы, усе мацней і мацней чутна паветраная музыка і ўрэшце, сапраўдны патоп з вульля і захапляючая музыка ўверсе. Нястрымнае імкненьне да новага жыцьця, да новай пшчэ больш цяжкай працы. Палятаўшы ў паветры, пчолы пачынаюць абвівацца на ветку якога небудзь дрэва.

ПЯРШАК (першы рой называецца першаком, другі—ДРУГАКОМ і наступныя—ПАРОЙНАМІ) трымаецца на прывіўцы досыць шмат часу (пакуль ня зьвернуцца, як думаюць некаторыя пчалаводы, высланыя разьведчыкі на адшуканьне новага жыцьця). Калі няма на пасецы дрэваў, ці дрэвы вельмі высокія, то неабходна наладзіць спэцыяльныя прывоі. Дзеля гэтай мэты зьяўляецца вельмі неабходным матар'ялам старая калода. Трэба спачатку калоду крыху апаліць зьверху, потым расколоць на дзьве палавіны і прымацаваць на кольлях унутраным бокам уніз. Карысна ў час раеньня прывоі час ад часу спрыскваць мядовай сытой (мёд разьведзены ў вадзе). Калі рой прывіваецца, трэба сабраць яго ў раёўню.

Пасаджаны ў раёўню рой сядзіць ціха, калі там знаходзіцца матка. У іншым выпадку пчолы моцна гудуць. Калі пчаляр заўважыць, што пчолы ў раёўні неспакойны—трэба ўважліва агледзець тое месца, дзе рой абвіўся, ці месца ў лятку таго вульля, з якога вышаў рой, ці няма там кучкі пчол і сярод іх маткі. Калі матка ня будзе адшукана, то рой трэба зьвярнуць у той вулей, адкуль вышаў, ці ўсыпаць яго на якую небудзь слабую сям'ю.

Раі другакі і паройкі

Раі другакі і паройкі пры выхадзе з вульля трымаюць сябе прыблізна таксама як і першакі, толькі гэтыя раі менш залатрабавальныя да пагоды, выходзяць на працягу ўсяго дня, прывіваюцца ня так густа, ня доўга сядзяць на прывоі, а часам пакруціўшыся ў паветры, зразу-ж і ўлятаюць. Прыблізна праз тыдзень пасьля адлету першага рою выходзіць адна з маладых матак і сям'я вырашае—ці раіцца ёй.

У гэты час трэба раніцой і вечарам прыклаўшы вуха да вульля выслухоўваць сям'ю, што адпусьціла рой і калі будзе чутна пеньне матак, дык у першы-ж ці другі дзень адраіцца другі рой.

З другаком выходзіць маладая неаплодатвароная матка. Часта бывае, што з другаком выходзіць некалькі матак. Калі ў раёўні другак раздзеліцца на дзьве ці некалькі нучак, значыцца ў ім ёсьць некалькі матак. Трэба лішніх матак зьнішчыць. У іншым выпадку паміж маткамі ўзьнікае бойка, якая цягнецца да таго часу, пакуль у жывых застанецца толькі адна.

Неабходна на пасецы мець гідрапульт (шрыц). Бляшаны шпрыц каштуе нядорага, а службу нясе вялікую. Пускаючы ўверх струмень за струменьню вады з шпрыцу можна стварыць для пчол ўражаньне дажджу, што садзейнічае хутчэйшаму прывою.

Пасадка рою ў вулей.

Раней чым садзіць рой у вулей, трэба падрыхтаваць сам вулей. Яго неабходна добра вычысьціць і спрыснуць мядовым растворам ці воскам зьмешаным з праполісам (праполіс—смалістая матэрыя, якой пчолы замазваюць унутры вульля шчыліны).

Потым вулей паставіць на тое месца, дзе ён будзе заўсёды стаяць. Калі гэта зроблена, трэба ў вулей паставіць патрэбную колькасьць рамак.

Вызначыўшы колькасьць рамак (у залежнасьці ад вагі рою: раньнім раям даецца ня больш як паўтары рамкі на фунт, а пазьнейшым адну рамку на 2-3 фунты) апошнія становяцца ў вулей такім парадкам: рамкі з большымі кавалкамі сушы ці з штучнымі лістамі ставяць у сярэдзіну, а па краёх з вузкімі палоскамі.

Пасадка рою робіцца пры дапамозе століка. Прыставіўшы вузкім канцом столік да вульля, а к століку раёўню, узяць чарпаком і пасыпаць на століку да самага летка. Увашоўшы ў вулей, пчолы весела загудуць, і тады неабходна ўвесь час падсыпаць пчол з раёўні на столік, сочачы за маткай, якую варта заперці ў клетачку і зьмясьціць у вулей паміж рамкамі. Праз дні два адтуліну клетачкі заляпіць плясьцінкай штучнай вашчыны, якую пчалу прагрызуць і выпусьцяць матку.

Пчаляр ЛІВАНСКІ.

Днём—станок, а ў ноч—паход

[illegible] гадзін працягваліся манэўры Менскага комсамольскага актыву.—Начны шыбкі паход, хадзьба пад палячымі праменьнямі сонца, 40 вёрстны пераход—паказалі выносьлівасьць і дысцыплінаванасьць Менскага актыву.—Манэўры—лепшая форма военізацыі комсамолу

Як ішла падрыхтоўка.

Ва ўсе прадпрыемствы гор. Менску [illegible] ячэек перадаваліся сакрэтныя [illegible].

— Абавязкова зараз-жа бяжы ў [illegible]. Вельмі важная справа.

У райкомах сакратарам ячэек даручаліся сакрэтныя пакеты з позвамі для [illegible] ячэйкі.

[illegible]—кароценькая, але глыбока за[illegible] яна ў галаве атрымаўшага яе.

— У суботу 16 ліпеня прапануецца табе зьявіцца а 8 гадзіне ўвечары на зборны пункт №....

Неабходна мець з сабой комсамольскі білет.

Аб гэтым павінен ведаць толькі ты адзін.

Толькі ты адзін. Не гаварыць нават [illegible] лепшаму таварышу.

Такія позвы былі пасланы ўсяму ак[illegible] Менскай організацыі.

[illegible] і рэдакцыя «Чырвонай Зьмены», думалі раней правесьці манэўры не толькі з актывам, а з усёй організацыяй. Гэта было-б 6000 чалавек. Былі-б грандыёзныя манэўры.

Але ўмовы не дазволілі. Вакол Менску няма для гэтага належнага месца—[illegible] пасевы. Прышлося пляны скарачаць. Ахапіць покуль актыў.

Позвы разьнясоўваліся сакрэтна. Але некаторыя з цікавых комсамольцаў пранюхалі.

Шмат іх прышло ў Райкомы з пратэстам.

— Чым мы горш актыву?—Мы таксама жадаем пайсьці.

Днём у суботу хадзілі комсамольцы [illegible] вуліцах з загадковымі тварамі.

Хацелася-б пагаварыць адзін з другім, распытаць. Але... не. Загадана маўчаць.

Зборных пунктаў было чатыры.

Першы—сад «КІМ». Сюды зьбіраўся [illegible] Горраёну.

Другі пункт—клюб «КІМ»—зьбіраўся [illegible] Акціябрскі.

Трэці—станцыя Заходняй чыгункі—[illegible] Ляхаўкі.

І чацьверты—дом Чырвонай арміі, [illegible] зьбіраліся комсамольцы курсаў інструктараў, пры Менскім Акругкоме [illegible].

На зборныя пункты.

Ужо а 6-ай гадзіне ўвечары можна было назіраць, як з розных куткоў Менску, з гарбарнай Ляхаўкі, з вагзалаў, з Сэрэбранкі і далёкай Камароўкі ішлі, накіроўваючыся да сваіх пунктаў, адзетыя па ваеннаму, комсамольцы.

Вось сустрэлі адзін другога два хлапцы.

— Ты куды?

— Я... ведаеш, так сабе... па справе... ну... на пасяджэньне... А ты куды?

— Я... таксама на пасяджэньне...

Рассталіся... зноў спаткаліся ў садзе «КІМ», паглядзелі адзін на другога,—усьміхнуліся, успомнілі пра пасяджэньне...

Пункты тым часам хутка запаўняліся комсамольцамі.

Пры ўваходзе на пункт чырвонаармеец і дзяжурны комсамолец адбіраюць комсамольскія білеты, позвы і кідаюць іх у мяшок. У дзьвярэй пункту № 2, можна заўважыць некаторых «мамачак», якія ўсхваляваныя прышлі паглядзець, куды гэта сабраліся іх сынкі.

На пунктах усе пераходзяць у распараджэньне вайсковых камандзіраў.

Хутка ідзе разьмеркаваньне вінтовак.

У штабе палка.

У акругкоме штаб палка.—У дзьвярэй штаба дзяжурны комсамолец, які без пропуску нікога не прапускае.

Кіраўнік манэўраў—тав. Тархаў і камандзір палка тав. Кавалёў аддаюць апошнія загады.

Военком палка тав. Рэмізевіч (сакратар Ляхаўскага РК, дае наказаньні політрукам эскадронаў—комсамольцам.

Гукі аркестраў абвесьцілі, што эскадроны з пунктаў падыходзяць к штабу.

Аддан Загад...

Пашлі за горад

Загад перададзен па эскадронам.

Полк раскінуўся вакол акругкому. Ён чакае каманды. Шмат людзей сабралося тут. У пеўразуменьні глядзяць яны на гэтае зьявішча.

Раптам каманда... Сьмірна,—прагрэмеў бас камандзіра палка тав. **Кавалёва**. А за ім па шэрагам пашлі каманды эскадронных і ўзводных камандзіраў. Басы, тэнары, альты перапляталіся разам у адну прыгожую музыку сьмірна...

Зноў каманда... Полк крануўся ў дарогу. Ідзем хутка. Вось горад ужо застаўся назадзі час. Там жыхары вырашылі і раздумвалі, куды-б гэта маглі пайсьці ўзброеныя комсамольцы?

Вышлі за горад. Сталі неяк прывальней. Пацяклі комсамольскія сьпевы.

Пыл, які чорнай хмарай абкружаў хлапцоў, не псаваў баявога настрою.

Месяц спакойна, з вышыні, зьяў над паходам.

Ішлі.. Подалек мы ўжо заўважылі абрысы Антонаўкі.

Каля Антонаўцы прывал.

На прывале ў Антонаўцы

У часе прывалу камандзіры даюць тлумачэньні.

— Таварышы! На нас напаў вораг. Мы прымушаны адступіць. Да нас падойдуць новыя сілы... Ніякай панікі... Вытрымка.. Парадак, у першую чаргу, павінен падтрымоўвацца комуністымі і комсамольцамі.

Сярод насельніцтва часта хаваюцца нашы ворагі-шпіёны. Захоўваць асьцярожнасьць—наша задача...

— Зразумела?

— Зразумела! — хорам падхапілі хлапцы.

Марш начнога пераходу

Зноў пашлі. Але інакш, чым раней... Мёртвая цішыня панавала ў шэрагах.

Курэньне фупынілі.

Толькі палышлі да лесу, як адлучыўся ўзвод разьведчыкаў і ўзвод дазорцаў.

Мы ідзём пад добрай абаронай.

Ціха...

Цішыню начной імглы прарэзаў бас тав. **Тархава**, які завёў гутарку з санітаркамі.

— Ці ведаеце, за чым мы ідзем з такой асьцярожнасьцю, чаму мы цяпер на курым?

— Каб вораг нас ня заўважыў, адказала адна спрытная дзяўчына.

— Які?

— Бязумоўна, у першую чаргу, вораг можа нас заўважыць з паветры, з аэраплану...

— Правільна—тав. **Тархоў здаволен** адказам.

— Кожная наша іскрынка ад папіросы, кажа ён,—можа быць ворагам скарыстана...

— Ты якога эскадрона?—пытаюся я ў аднаго хлапца.

— **Трэцяга слаўнага эскадрону**—з гонарам адказаў ён.

— А колькі ўзводаў у тваім эскадроне?

— А гэта, братка, **ваенная тайна...**

Уперадзе—авангард, з заду—ар'ергард, па баках—дазоры. Сувязь з імі трымаем праз валёсыпэдыстых «сьвязістаў», якія штохвілінна прыбягаюць з данясеньнямі...

Прывал у Трасьцінца

Пачынала сьвятаць, калі мы падыходзілі к Трасьцінцу. Недалёка ад яго, у лясочку—адпачынак. Чакаем загадаў камандзіра палка.

Вакол нашай «паходнай» кухні—цялегі МЦРК сабралася вялікая чарга.

— МЦРК,—кажа адзін хлапец,—бяз чаргі ня можна абыходзіцца.

— За тое дырэктывы партыі аб зьніжэньні цэн тут выконваюцца,—адказаў, купіўшы ўжо кілбасу і булку, хлапец.

Прывал у Трасьцінца скарысталі нашы політрукі. Былі праведзены па эскадронам **«політчасы»**.

Тут,—растлумачвае адзін камандзір,—мы атрымалі падмацаваньне і сёньня, а 6-ай гадзіне раньніцы, пэройдзем у наступленьне.

— Перад намі зараз пастаўлена задача—выбіць праціўніка з лесу. А к 12 гадзінам дню Менск павінен быць у нашых руках.

Пераходзім у наступленьне.

4-ты эскадрон ужо пашоў у разьведку. Валёсыпэдысты развозяць даручэньні.

Атрымалі паведамленьне, што вораг разьмясьціўся ў лясочку, каля лягераў Беларускай дывізіі і мае добрыя акопы.

Каманда—эскадроны, **„стройся“**... і хутка нярухомая маса комсамольцаў была гатова да выступленьня. Рэмні вінтовак зноў селі на падёртыя за ноч плечы.

— Тав. камандзір,—скардзіцца адна дзяўчына,—**чым мы горш хлапцоў**. Мы былі-б ня горшымі стралкамі.

Эх,—ня выцярпеў адзін хлапец, з цябе стралок, як з... запнуўся... усе загагаталі...

5 гадзін раньніцы... Сьвежае паветра абмывае твары ня спаўшых цэлую ноч комсамольцаў... Многія з нецярплівасьцю чакалі бойкі.

І раптам, паведамленьне нашых разьведчыкаў... Блізка разьведка ворага.

Бой.

Прашлі мэтраў з сотню... Бяжаць... раздаецца каманда.

Пабяжалі...

Раптам загагатаў кулямёт праціўніка.

Многія леглі на зямлю і пачалі поўзаць.

— У лесі—крычыць камандзір,—дрэва нас абароніць ад кулямёту.

Перабеглі горку.

З чатырох бакоў наступаем на ворага.

З пярэдніх акопаў яго ўжо выбілі.

Нейкае захапленьне ахапіла ўсіх.

— Варта было тав. Кавалёву крыкнуць—«ура»... «дайш»... як многагалосае громкае ур...р...ра... правацілася па нашай лініі.

Кінуліся ў атаку..

Вораг зьбіт... Шмат палонных.

Закіпела праца і санітарнай каманды.

Вось у аднаго, дзяўчына—санітарка выцягвае з вока камара. А хлапца, у якога пашла кроў з носу, абярнулі нагамі ўверх.

Бойка сьціхла...

Яшчэ дзе-ні-дзе часта разлаюцца асобныя выстрэлы... Хлапцы скарыстоўваюць астаткі халастых патронаў...

Вынікі манэўраў.

Адчуваецца нейкая змораласьць.

За выключэньнем некаторых выпадкаў, дысцыпліна ў нашым палку добрая.

Гэта аднагалосна камандзіры пры пахвядзеньні вынікаў манэўраў.

Тав. Рубін паведаміў пра гультайства, недысцыплінаванасьць некаторых комсамольцаў, якія нават забываліся пра свае вінтоўкі.

Наогул-жа, манэўры сабе апраўдалі.

— Экзамін мы вытрымалі,—сказаў наш камандзір. За 15 гадзін прашлі каля 40 вёрст.

Зварочваліся назад у гарачы сонечны дзень, калі сонца бязьлітасна пякло.

Комсамол рыхтуецца і падрыхтуецца да будучых боек.

Аб гэтым сьведчаць праведзеныя манэўры.

Р. Гольдзін.

Справы і дні Задубскай ячэйкі.

ПАСЁЛАК „ІЛЬЛІЧ“. — СЯМ'Я З АДНЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ. МІХАЙЛА КУПРЭЕЎ СУМУЕ НА СВАЮ СТАРАСЬЦЬ, ЯКАЯ МЯШАЕ ЯМУ ФАРМАЛЬНА СТАЦЬ КОМСАМОЛЬЦАМ.—КУЗЬМА КЛІЧЭЎСКІ РЫХТУЕ ГЛЕБУ ДЛЯ СТВАРЭНЬНЯ „КАМУНІ“.—БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ У ВЯЛІКАЙ ПАГОДЖАНАСЬЦІ ВЫРАШАЮЦЬ ГАСПАДАРСКІЯ ЗАДАЧЫ.

Дзеці і бацькі

Пасёлак „Ільліч“.

Калісьці ў Задуб'і было некалькі чалавек такіх беднякоў, у якіх **хлеба** са свайго ўласнага поля хапала **толькі на** 1-2 месяцы, а каб не паміраць з голаду, [illegible] галоўным работнікам з гаспадарак ісьці ў плытагоны і на хвалях [illegible] ісьці з ярусамі бровень на поў[illegible].

Так было раней.

Калі паны паўцякалі да «панства [illegible]» і гаспадаром іх вялізарных плошчаў зямлі стаў той батрак і бедны [illegible], што ўсё жыцьцё сваё працаваў на [illegible], задубскія бедзякі—плытагоны [illegible] хадайнічаць аб водпуску ім панскай зямлі, што пуставала тут-жа каля [illegible].

Саветы зямлю адпусьцілі. Дзевяць беднякоў кінулі свае мізэрныя вучасткі і [illegible] поглядам большай часткі [illegible]: **«Хутка прыедуць з Варшавы гаспадары, што тады рабіць будзеце“**—вышлі на пасёлак, імя якому далі «Ільліч».

Цяпер з пасёлку **«Ільліч»**, асялёная беднатою, яскравымі праменьнямі і [illegible] на сельсавету ўсё сьвятло сё[illegible], повага дзяю. Тут і старыя і малыя—**лічаць сябе (і ёсьць так) комсамольцамі.**

Сям'я з адных комсамольцаў.

Міхайла Купрэяў мае шмат чаго [illegible] з пражытага на сваім веку. Галоў [illegible] пятнаццаць у плытагоны хадзіў. Ведае [illegible] кожны парог на Дняпры, як свой двор. Крыху пісьменны. Гэта яму дало магчымасьць быць ластаўнікам у сваёй і суседніх вёсках.

Партызанам быў у грамадзянскай вайне. У дні соцыяльнай буры і агню 1917 і 18 гадоў, **Міхайла Купрэеў—старшыня Доўскага рэўкому.**

Купрэеў Аўхім

Міхайла ганарыцца сваім пражытым. **„Гэта для мяне школай зьявілася“**—кажа ён. Ня менш ганарыцца і радуецца сваімі дзецьмі: іх у яго чатыры (два сыны і дзьве дачкі) і ўсе ў комсамоле.

Меншы сын **Нічыпар**—два гады сакратарствуе ў комсамольскай ячэйцы, столькі-ж трымае на нагах і ўсю працу Задубскага сельсавету.

Раней быў **сторажам** у Карманскім Нардоме. Жыў у халодным пакоі сумесна з бацькамі і мышамі, а політыкай займаўся старанна. Праз некаторы час Нічыпара пераводзяць з **стоража у Загадчыкі Нардому.**

У 1923 годзе паступіў у комсамол. 1906 года нараджэньня. Рыхтуецца да пераводу з кандыдатаў у сябры партыі.

З першых дзён свайго сакратарства, Купрэеў Нічыпар высунуў прад ячэйкай пытаньне **гаспадарчага будаўніцтва**, увесь час налягаў на яго, і ў выніку **колектыўнай стараннасьці** Зарубскі сельсавет мае шэраг тых вялікіх дасягненьняў, аб якіх казалі мы вышэй.

Нічыпара другі раз выбралі ў сакратары сельсавету. І ён старанна і сумленна выконвае свае абавязкі, ахвотна дапамагае старшыні, які, дзякуючы малапісьменнасьці, слабавата разьбіраецца ў сваіх абавязках і правох; ахвотна піша самыя рознастойныя, адносіны і заявы для задубцаў і ня можа не ганарыцца, калі яго ўсе старыя і маладыя паважаюць і хваляць.

Вельмі цікавіцца **інтэнсыфікацыяй сельскай гаспадаркі.** Вядзе вучот прыбыткаў і выдаткаў, запісвае дзень нараджэньня **рабенькага цяляткі, месца пасева лёну, чаргаваньне пасеваў і інш.** здарэньні ў гаспадарцы.

Жадае разгрузіцца ад працы ў сельсавеце, каб цалкам аддацца выкананьню намечаных ячэйкай масавых гаспадарчых задач.

Аўхім—старэйшы сын Міхайлы. Самы стары зараз комсамолец у ячэйцы. Быў сакратаром ячэйкі, некальки разоў паліт'асьветчыкам, сябрам бюро. Незамяніны ў ячэйцы кіраўнік палітзаняткамі і гурткамі бягучай політыкі.

Быў дабраволыцам у Чырвонай гвардыі.

Цяпер сваім прыкладным трыманьнем сярод дарослых сялян, і ў хаце павялічвае аўторытэтнасьць ячэйкі.

Поля—старэйшая сястра Нічыпа а і Аўхіма. Маленькай засталася ад маткі. Увесь час прыходзілася і прыходзіцца выносіць на сабе цяжар жаночай працы ў гаспадарцы. Ця сваёй ахвоце паступіла ў Комсамол. Вельмі добра даглядае карацельлоты, а таксама значна павялічыла ўраджайнасьць агароднікы, ас бліва капусты (у мінулым годзе яна вырасьціла качан капусты вагаю блізка пуду). Заўсёды прыходзіць на сходы ячэйкі з беспартыйнымі дзяўчатамі.

Купрэеў Нічыпар

Уляна—самая маладая ў сям'і. Піонэрка-комсамолка. Старанна скончыла ВШСМ. Цяпер рэгулярна чытае часопіс «Беларускі Піонэр» і газэту «Чырвоная Зьмена».

Ёсьць на што глянуць, ёсьць чым палюбавацца, калі Міхайлавы дзеці, ведаючы, што сёньня ўвечары занятки ў гуртку, ці сход ячэйкі, пад песьні бадзёрыя пачнуць увіхацца на полі каля працы.

Ідуць разам на сход, жартуюць, сьмяюцца; вяртаюцца дамоў—спрачаюцца па якому-небудзь пытаньню ці рая ца, што заўтра рабіць па гаспадарцы.

Глядзіць Міхайла на сваіх і другіх дзяцей—комсамольцаў і недаволен толькі адным: **што гады вялікія і сам ня можа быць комсамольцам.**

Але Міхайла па справе—комсамолец. Для яго **абавязкова кожная пастанова ячэйкі**, ён жыве ячэйковай радасьцю, хварэе за яе няўдачы. **Не прапусьціць ні аднаго маленькага артыкульчыка у газэтах „Комсомольская Правда“ і „Чырвоная Зьмена“. „Маладыя і бадзёрыя,—кажа ён, — газэткі, пачытаеш, здаецца, гадоў на 30 маладзейшым стаў“.**

Будзем у Камуні!

Па пасёлку **„Ільліч“** жыве і другая, вельмі ціхая, сям'я **Клічэўскіх.**

Кузьма Клічэўскі (старэйшы у сям'і і гаспадарцы)—першы актывісты у Карманскім раёне. Працуе уваўнаважаным крэдытнага таварыства, сябрам праўленьня с.-г. таварыства імя «Чарвякова», мае некальки паяў у коопарацыі. Надзвычайна ўвяўся за палепшаньне сельскай гаспадаркі.

Кузьму непакоіць адно, што на пасёлку ёсьць яшчэ некальки чалавек не падрыхтаваных да працы у колектыве. Так-бы зараз-жа ўтварылі «камуню».

Трое дзяцей Клічэўскіх у Комсамоле. З іх адзін сын вучыцца у Менску, у **БДУ.** У ячэйцы—і бацька і дзеці самыя актыўныя працаўнікі.

* * *

Наогул, комсамольцы Задубскай ячэйкі вельмі згуртаваны паміж сабою, вельмі ладзяць з бацькамі і з усімі старэйшымі у сям'і, колектыўна разьвязваюць усе гаспадарскія задачы.

А прыкладнасьць комсамольцаў **Купрэевых, Клічэўскіх, Барысенкі Цімаха** (самастойны гаспадар, любімец вясковай моладзі. Жыцьцё аддае за інтарэсы беднаты), **Мядзьведзева Максіма, Міхалькова Ягора, Філіпенкі Ігната** і др., прымусіла аднаго старога Задубскага селяніна, які раней быў нават ворагам настроен супроць Саветаў, прыйсьці на юбілей ячэйкі і трымаць такую прамову:

Каб ня нашы дзеці—комсамольцы, дык чаго-б мы былі варты?! Ня мелі-б коопэратыву, таварыства, палепшаных ураджаяў, машын розных для апрацоўкі поля... наогул, жылі-б пастарому.

Саюзныя навіны

Маёўка ў Ждановічы

Менскі АК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ распачалі падрыхтоўку да грандыёзнай маёўкі Менскай гарадской комсамольскай організацыі ў Ждановічы.

Маёўка вызначана на нядзелю 31 ліпеня. Да яе прыцягваюцца вайсковыя спэцыялісты. Маёўцы будзе прыдадзен вайсковы ўхіл. Адміністрацыя чыгункі адпускае спэцыяльны поезд.

Комсамол Віцебшчыны.

Культ масавая праца па раёнах.

Віцебскі АК ЛКСМБ на чарвень м-ц правёў шэраг цікавых культурна-масавых мерапрыемстваў.

У агульна-гарадзкім маштабе праведзены масавыя паходы ў аўрэйскі і гарадзкі тэатры.

Сеньненскі РК ЛКСМБ пачаў выданьне райгазэты па распаўсюджваньню вопыта, правёў масавае катаньне на лодках па возеры.

Езярышчанскі райком правёў масавую экскурсыю местачковай моладзі на раённую выстаўку насьценгазэт. Рыхтуюцца: конкурс на лепшую ячэйку па распаўсюджваньню юнацкага друку і вечары беларускай поэзіі.

Пролетарска-Слабадзкі райком рыхтуе экскурсыю ў Ленінград, нядаўна ён правёў экскурсыю на лодках ў г. Полацк.

Гарадзкі раён правёў конкурс на лепшага музыканта па Выраўлянскаму сельсавету.

Яшчэ 110

Распачалася падрыхтоўка ў Ляхаўскім Райбюро ЮП, да выхаду другой групы ў раёны піонэрскі лягер, які знаходзіцца ў Прылуках. Колькасьць другой групы—110 чалавек.

Піонэрыя будуе крыло

самалёту „Менскі Гарсавет“

Праца па збору грошаў Менскай піонэрскай організацыяй на карысьць крыла самалёта „Менскага Гарсавету“ ў разпале. Ужо сабрана больш 20 рублёў. Збор грошай павінен быць закончан да 15 жніўня.

Пасьля „Тыдню абароны“

20 новых ячэек ТСААвіяхіму

За „Тыдзень абароны“ у Менску з'організавалася 20 новых ячэек ТСААвіяхіму. Зрачна ўзрос лік членаў існаваўшых ячэек і ўзмацнілася іх праца.

20 стралковых цiраў

Каля 20 новых стралковых ціраў організаваны у выніку „тыдню абароны“.

Газаакурыцельная камера ў Менску

У Менску пабудавана газаакурыцельная камера, якая кожныя 2 тыдні будзе правучаць членаў ТСААвіяхіму праз газаакураньне.

Кружачныя зборы і лётарэі

Ад кружачных збораў і лётарэяў за „тыдзень абароны“ сабрана па Менскай акрузе 2500 рублёў у фонд „Наш адказ Чэмбэрлену“.

Хадакі у цэнтры

(Прыемны пакой ЦВК БССР)

Пляц Волі. Невялічкі надпіс—прыемная ЦВК. Як увойдзеш, трэба зарэгістравацца пачакаць чаргі.

12 гадзін. З нейкага пасяджэньня зварочваецца старшыня ЦВК т. Чарвякоў і пачынае прыем.

Першы па чарзе—селянін Аршанскай акругі тав. Саўчэнка.

Ён скардзіцца на пастанову Зямельнай Камісіі, якая ў гэтым годзе яму не дала сенакосу.

Тав. Чарвякоў задае 2-3 запытаньні і справа вырашана. Ён піша на асобнай паперцы запіску ў Зямельную Камісію, каб пастанову пераглядзець. Селянін, задаволены, адыходзіць.

Яго абкружаюць чакаючыя, пытаць, цікавяцца, што параіў, чым дапамог старшыня ЦВК.

Прыем ідзе. Тут, у гэтым невялічкім пакоіку вырашаюцца і дробныя справы, і скаргі сялян, і важныя дзяржаўныя справы. Сеньня прымае тав. Чарвякоў, заўтра беспартыйны селянін, сябра прэзыдыуму ЦВК БССР т. Масальскі, назаўтра другія і г. д.

Ідуць штодзённа сюды з далёкай Полаччыны, з Аршаншчыны, Мазыршчыны, ідуць пехатой, едуць на цягніках, падводах, зьбіраюцца каля будынку ЦВК, каб даўшы коням сена, пайсьці ў прыёмную. І кожны селянін атрымае вырашэньне сваёй справы. Пасьля, вярнуўшыся ў сваю вёску, апавядае ён сваім сялянам аб тым, як у невялічкім пакоіку вырашаюцца вялікія справы, патрэбныя для дзяржавы, для рабочых і сялянства.

Зд. Ш.

Зварот трупы Галубка

Пасьля трох месяцаў працы у падарожжы трупа 20 ліпеня зьвярнулася ў Менск.

Абслужаны Калінінская і Гомельская акругі у якіх дадзена да 85 спэктакляў, з лікам гледачоў даходзячым да 70.000.

Тэатр абслужыў шмат з'ездаў як комсамольскіх, батрацкіх, настаўніцкіх і інш.

Спэктаклі наведвалі пераважна сяляне, батракі, комсамольцы, настаўнікі і вучні.

Сяляне на спэктаклі допускаліся зусім дармова.

Тэатр пабываў у Горках, Клімавічах, Мсьціслаўлі, Крычаве, Чэрыкаве, Чырвонапольлі, Касьцюковічах, Увечы, Добрушы, Гомлі, Беліцы, Ветцы і Рэчыцы.

Надзвычайным посьпехам карыстаўся тэатр на Гомельшчыне: рабочыя Добрушскай і Нова-Беліцкай фабрык вынесьлі падзяку трупе за яе працу у іх раёне.

Усебеларуская здраўніца.

З 1-га жніўня ў мястэчку Чарніцах пачынае працаваць Усебеларускі Рэспубліканскі дыспансэр па костна-туберкулёзным хваробам.

Дыспансэр разьлічан на 100 чалавек.

Першы ў Гомельшчыне.

Нарком Аховы Здароўя адпусьціў сродкі на пабудову першага ў Гомельшчыне начнога стацыянара.

150 торпараспрацовак.

Заўважваецца моцны рост торпараспрацовачных работаў на Беларусі. У мінулым годзе налічвалася 76 торпараспрацовак, у гэтым годзе—150.

НАШ ЭКРАН.

Аўстрыйскія піонэры.

На здымку—атрад аўстрыйскіх піонэраў ў часе дэмонстрацыі, арганізаванай аўстрыйскім комсамолам.

Сваімі рукамі.

Маладыя радысты будуюць свой уласны прыемнік.

Помнік растрэляным комсамольцам у Вене

У 1919 годзе 19-га чэрвеня ў часе вулічнай схваткі ў Вене між рэволюцыйнымі рабочымі і паліцыяй апошняя забіла 17 комсамольцаў. У гэтым годзе ў дзень гадавіны забойства, аўстрыйская компартыя і комсамолам пастаўлен помнік забітым маладым рабочым. На помніку надпіс: „Будзем верны загінуўшым барацьбітам“.

ЦЭНАМ ДАРОГА—ІСЬЦІ УНІЗ

Мылу ад цэнаў ня міла

Каму патрэбна мыла? Усім, асабліва гаспадыням. Чаму-ж аднальковае мыла каштуе розна?

Магазын МЦРК прадае мыла па 18 кап. кусок, аптэка—па 19 кап. кусок, ТПО МББ—па 20 кап. кусок.

Соду для бялізны МЦРК прадае за 16 кап., ТПО—за 17 кап., аптэка—за 20 кап.

Б. Г.-к.

Раней чым шапку адзець, трэба цану паглядзець

Заходжу ў магазын Мінявея. Мне трэба купіць простую шапку. Пытаю цану. Шапка з простай чорнай матэрыі каштуе 1 р. 15 кап. Мысьлю сабе, што дорага. Накіроўваюся ў МЦРК, а там яшчэ даражэй, просяць за яе 1 руб. 25 кап., а прыватнік за такую самую шапку просіць 1 руб. 10 кап., а прадае за рубель.

Вось і купляй так шапку!

„Драбніцы“

У працу коопэрацыйнага і дзяржаўнага гандлю сустракаецца шмат так званых „драбніц“, якія, ня гледзячы на сваю драбнаватасьць, шкодзяць працы гандлюючых установаў і адпыхаюць спажыўца.

Возьмем самы звычайны, жоўты ў костках, баціст.

У універсальным магазыне Менскага ЦРК ён каштуе 48 з пал. кап., а у магазыне № 19, таго-ж МЦРК 58 з пал. к.

„Невялікая“ розьніца, усяго 20 з лішнім процантаў невядачы!

Гэта завецца „дробязьзю“!

І. Фішбэйн.

Цэны танцуюць

І ёсьць чаму плакаць. Атрымае рабочы свой заробак і гутарыць з жонкай не аб тым што купляць, а дзе купляць, бо ў горадзе ёсьць 20 крам і 20 цэн на аднальковыя тавары.

Напрыклад трэба купіць матэрыі дзецям на кашулі.

— МЦРК прадае мэтр белай матэрыі па 52 кап.

— ТПО МББ—па 51 кап. ТПО Заходняй чыгункі—па 50 кап. Белларок—па 54 кап. і магазыны МІКА - па 56 кап.

— Ясна, што тут трэба мысьліць не аб тым, што купляць, а дзе купляць.

„НАШ АДКАЗ ЧЭМБЭРЛЕНУ“

Артдывізіёнам 5-га Стралковага Палку 2-ой Беларускай Дывізіі за час праведзеньня „Тыдню абароны“ між чырвонаармейцаў дабраахвотна сабрана грашыма 7 руб. 3.. к., якія адасланы на пабудову эскадрыльлі „Наш адказ Чэмбэрлену“.

У зборы прынялі актыўны ўдзел комсамольцы дывізіёну.

Адначасова заклікаем і другія дывізіёны 2-й Беларускай Дывізіі пасьледваць нашаму прыкладу.

СУД

„Вясёлы шлюб“

Размашыста і гучна пеў гармонік. П...ямі ногі лёгка скакалі, аж падлога дрыжала. Па кутках абніваліся і горача цалаваліся хлапцы з дзяўчатамі. На вуліцы стаялі лютыя маразы, але ў хаце жара ўсіх прымушала паліць.

Весела, адным словам, было тады ў вёсцы Пральні, Вялыніцкага раёну: два шлюбы праходзілі ў адзін вечар.

Цётка Якаўлева Дар'я асабліва была шчасьліва ў гэты вечар: яна выдавала сваю дачку замуж. Тут-жа на шлюбе сядзелі і маладыя плямяньнікі: Ларчэнкі Пятрок і Базыль, Жукавы Трафім і Марка.

Весела і спакойна скончыўся-б шлюб у хаце цёткі Дар'і, каб не пачуўся стук у вакно... За стукам вылецела разьбітая шыба.

На гэта адразу выскачылі з хаты браты Ларчэнкавы і Трафім Жукаў. Галовы іх кружыліся ад самагону. Нічога ня ведаючы, „молодчиком“ чамусьці паказалася, што вокны біллі праходзіўшыя ў гэты час з другога шлюбу Кабазевы Сямён і Аляксей. Доўга не думаючы яны прыняліся іх біць коламі. Тыя ўцяклі.

Але на гэтым справа не скончылася. Цётка Дар'я пачала скардзіцца ў сельсавет што ў яе разьбілі вокны. Па дарозе яна спаткала члена сельсавету Сідарэнка і спаткаўшая тут жа брата выдаўна толькі напрамкаў Кабазевых.

Усе ўтрох яны накіраваліся на месца шлюбу. Але не пасьпелі яшчэ падыйсьці да ганку, як з двара выскачылі Патрок і Базыль Ларчэнкавы і коламі пачалі збіваць Кабазеева Аляксея, які ад удару праз два дні памёр.

Жукаў Трафім у гэтым не ўдзельнічаў. Але, стаўшы з колам на дварэ, ён не раз гледзячы ўдарыў члена сельсавету.

Магілёўскі Акруговы суд, разглядаўшы гэту справу, прысудзіў: Ларчэнкава Патра—да 3 гадоў, Базыля—да 2 гадоў і 8 месяцаў і Жукава Трафіма да 2-х год зьняволеньня без строгай ізаляцыі.

Вярхоўны Суд, куды абскаржаны падсудныя касацыю, вынес рашэньне: ў адносінах да Трафіма Жукава, за недаказанасьцю абвінавачваньня, справу аб ім спыніць; справу Ларчэнкі Базыля перадаць на новы разгляд Акруговаму суду; у адносінах да Пятра Ларчэнкі прыгавор пакінуць у моцы.

М. З—к.

Пяць тыдняў

Пяць тыдняў «Чырвонай Зьмены», як пяцітыднёвік прашоў.

Газэта зьмяшчала матар'ялы як «Чырвоная Зьмена» распаўсюджваецца на месцох, як яе скарыстоўваюць у сваёй працы ячэйковыя актывісты, што перашкаджае яе распаўсюджваньню, аб ролі юнкора ў пашырэньні сваёй газэты.

За гэты пэрыод многія ячэйкі вынесьлі пастанову павялічыць падпіску на газэту. У некаторых ячэйках гэта прашло пад лёзунгам: «кожны комсамолец выпісвае сваю газэту—«Чырвоную Зьмену»». У Менску (гарадзкі раён): «выпісваць актыву, ячэйковым працаўнікам газэту на 6 месяцаў». Засталося гэтыя пастановы праводзіць у жыцьцё, каб яны не засталіся ў стадыі пажаданьняў, шмат абяцаючых протакольных пастаноў, бо часта за пышнымі пастановамі хаваюцца малыя справы.

За пашырэньне тыражу газэты павінен узяцца актыў: мы наглядалі зьявішча што наш актыў не даацэньвае газэты, лічачы, што яна ня можа нічога даць актыву, забываючы, што ня чытаючы газэту, ён ня будзе ведаць, чым жывуць комсамольскія масы, якімі кіраваць у працы заклікан ён, актывісты. Ён ня будзе ведаць якімі шляхамі расьце сьвядомасьць комсамольскіх нізоў, куды пойдуць, каб лепш кіраваць і дапамагаць у саюзнай працы.

Дый газэта самому актывісту патрэбна. У матар'ялах зьмешчаных у працягу пяцітыднёвіка мычыталі як актывісту трэба было выкласьці і сутнасьць лісту замужніх комсамолак Менску, і як ён не знайшоўшы «Чырвонай Зьмены», дзе гэты ліст быў надрукован, прымушан быў будаваць даклад сваім адумам, высасываць яго з пальца, займацца ў працягу некалькіх гадзін нікому непатрэбнай гаварыльняй.

Газэта дасылала матар'ялы да летняй політвучобы і ў зусім ня цікавым становішчы апынуліся актывісты забыўшыя ў гэты час на газэту.

Распаўсюджваньне газэты да гэтых часоў было ўскладзена на плечы ўпаўнаважаных па друку. Упаўнаважаны часта не працаваў і вядома зрываў гэтым усю справу прасоўваньня газэты да комсамольцаў. На гэту працу, бывае, вылучаюць таварыша, які зусім не цікавіцца газэтаю і абавязак несе толькі ў сілу гэтага абавязку: адносіны казённыя і бязумоўна ніякіх жаданых вынікаў не даючыя. Такі упаўнаважаны падпіску зьбірае мэханічна пазяхаючы ад нуды ў руку, альбо пагубляе ўсе адрасы сабраўшы грошы, ці выпісаўшы і атрымаўшы квітанцыі больш не паклапаціцца, каб газэта папала ў рукі тых, хто яе выпісваў. Часта з боку комсамольцаў наглядаліся нездаровыя адносіны да свайго упаўнаважанага, калі у часе правільнай падпіскі, яны наўмысьля не давалі грошай, дабаўляючы: «На даем табе зарабіць». Зусім абывацельскі погляд!

На працу ўпаўнаважанага трэба вылучыць комсамольца, які любіць гэту справу, жыве ёю, клапоціцца, каб газэта была ў яго ячэйцы. Яшчэ лепш будзе калі за гэту справу возьмецца кожная ячэйка, падтрымоўваючы свайго ўпаўнаважанага, і патрэбна, так актывістыя, зараз гэты абавязак прынялі на свае плечы, каб яны лічылі зараз гэта адным з галоўных вучасткаў сваёй работы.

Хваля ўзмоцненай увагі да газэты, якую падняў пяцітыднёвік, павінна згуртавацца вакол таго, што выявілася як адмоўнае на працягу пяцітыднёвіку на месцох, каб яго паступова зьнішчыць.

Хата-чытальня у вёсцы. Шмат ходзіць сюды моладзі. Газэта тут для моладзі бязумоўна трэба, але днём з сьвечкамі ня знойдзеш.

Комсамольцы чытаюць газэты наогул, і ў пытаньнях, напрыклад, міжнароднага жыцьця, выяўляюць сябе «не прэвзойденными» пешкамі, на пытаньні сялян даюць такія адказы, што ў вачу мутна робіцца ад іхняй бязглуздзіцы.

Пошта яшчэ шмат псуе справу з дастаўкаю газэты. Трэба, каб ячэйкі на месцох зацікавіліся гэтым і разам з поштаю, а дзе і праз вышэйшыя інстанцыі зьнішчылі гэтую недарэчнасьць.

Газэта павінна прасякнуць у шырокія гушчы комсамоліі.

Пяцітыднёвік заваструў на гэтым увагу—кампанія закончылася.

Засталіся наперадзе—дні будзённай і настойна неабходнай зараз работы.

М. Блонскі.

У маладых камунальнікаў

Умовы працы

Цяжкія умовы працы сярод моладзі Саюзу Камунальнікаў: большасьць моладзі працуе ў саматужных прадпрыемствах. Тр. удумовы, хоць і заключаюцца, але не заўсёды выконваюцца саматужнікамі. Тым ня менш, за апошні час саюз па працы сярод моладзі мае значныя дасягненьні.

Лік моладзі расьце

Каб параўнаць лік моладзі Саюзу Камунальнікаў мінулага году з гэтым, то мы убачым вялікі рост ліку моладзі за гэты час. Агульная колькасьць моладзі, занятай на вытворчасьці,—павялічылася на 20 проц.—усяго моладзі у Саюзе Камунальнікаў 424 чалавекі.

Праца у саматужнікаў

За апошні час уцягнута на працу ў саматужных прадпрыемствах 68 падлеткаў Саюзу Камунальнікаў. Усяго на прыватных прадпрыемствах зараз знаходзіцца 82 падлеткі.

Зарплата павялічваецца

Падлетак-камунальнік у мінулым годзе ў сярэднім атрымліваў 7 руб., зараз 13 руб. 50 кап. у месяц.

Кожныя 6 месяцаў праводзіцца праверка насьпяховасьці вучняў і ў зьвязку з гэтым павышэньне іх заробку.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.